ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (859) ● ЧАЦВЕР, 5 кастрычніка 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXV



*НА ЗДЫМКАХ: студэнты І курса геаграфічнага факультэта на лекцыі па геалогіі, якую чытае дацэнт Д. М. КАРУЛІН.*

Фота **Д. Чаховіча.**





## ГОСЦІ З АЎСТРЫІ

Нядаўна універсітэт наведала прыбыўшая ў СССР па запрашэнню Камітэта маладзёжных арганізацый дэлегацыя Камуністычнага саюза моладзі Аўстрыі на чале з членам сакратарыята Саюза Жазефінай Сайф. У саставе дэлегацыі студэнты і рабочыя з федэральных зямель Аўстрыі. У камітэце камсамола адбылася сяброўская сустрэча. Сакратар камітэта камсамола Алег Слука расказаў аб 50-гадовай гісторыі універсітэта, аб справах універсітэцкай камсамоліі. Пасля абмену думкамі гаспадары паказалі гасцям свой універсітэт.

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**

## ЗА СТУДЭНЦКАЙ ПАРТАЙ — ВЫКЛАДЧЫКІ І СУПРАЦОЎНІКІ

Да пачатку навучальнага года ў сістэме партыйна-палітычнай адукацыі рыхтаваліся загадзя. На пасяджэнні парткома, якое праходзіла ў канцы верасня, член парткома Р. А. Малюковіч дакладваў: ва універсітэце будзе працаваць 41 тэарэтычны семінар (у мінулым годзе было 34), у шасці з іх галоўная ўвага ўдзяляецца пытанням эканамічнай адукацыі; чатыры школы асноў марксізму-ленінізму, 15 пачатковых паліт-школ. Падабраны кіраўнікі, вызначана тэматыка.

І вось у панядзелак арганізавана пачаліся заняткі на ўсіх факультэтах. У семінары факультэта журналістыкі, перш чым павесці размову пра пастанову ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння СССР», прафесар Анатоль Яфімавіч Жураў расказаў аб сваіх уражаннях, якія засталіся ад наведання Грузіі, Азербайджана і іншых Савецкіх рэспублік, аб працавітасці і сяброўстве, высокім патрыятызме савецкіх народаў, аб павазе і любві, з якімі сустракалі ўсюды прадстаўнікоў Беларусі.

* * *

У фізікаў супрацоўнікі кафедр згрупаваны вакол чатырох семінараў. На першыя заняткі ў семінары акадэміка М. А. Ельяшэвіча прыйшлі супрацоўнікі кафедр атамнай і малекулярнай фізікі, фізікі цвёрдага цела, электрафізікі. У цэнтры ўвагі гэтага семінара — развіццё метадаў навуковага пазнання ў гістарычным аспекце. Серыю дакладаў адкрывае лекцыя «Геліяцэнтрычны светапогляд Каперніка». Наступныя будуць прысвечаны навуковым даследаванням Галілея, Кеплера, Дэкарта, Ньютана, Лейбніца і іншых.

Асноўны напрамак семінара, які ўзначальвае дацэнт А. У. Самускевіч, — філасофскія праблемы касмагоніі, касмалогіі і фізікі элементарных часцінак. Тут рыхтуюцца даклады: «50 год СССР і развіццё фізіка-матэматычных навук у нацыянальных рэспубліках», «Філасофія прыроды Л. Фейербаха» (да 100-годдзя з дня смерці), «Метадалагічныя праблемы сучаснай касмалогіі» і інш. У гэтым семінары ўдзельнічаюць супрацоўнікі кафедр тэарэтычнай фізікі, спектральнага аналізу і фізічнай оптыкі, кафедры фізікі.

Філасофскія праблемы прыродазнаўства будуць разглядацца і ў семінарах, якімі кіруюць дацэнты У. К. Прахарэнка і І. Г. Родзін.

* * *

Навучальны год ў семінары юрыдычнага факультэта адкрыў прафесар С. Р. Віхараў лекцыяй «Утварэнне СССР — перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі». Тут запланавана абмеркаваць наступныя даклады: «Сацыялагічныя даследаванні ў юрыдычнай навуцы», «Роля прававой навукі ў барацьбе з ідэалогіяй імперыялізму», «Роля права ў развіцці савецкай эканомікі» і іншыя.

**С. ЖАЎРЫД, М. МАЦЕЙКА.**

## «НАМ ПЯЦЬДЗЕСЯТ!»

Пад такім дэвізам адбудзецца агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў. Удзельнікі ж універсітэцкіх народных калектываў прымуць удзел у рэспубліканскім конкурсе. Харавая капэла запрошана на конкурс «Ювентус-72», які адбудзецца ў Каўнасе.

У гэтым навучальным годзе праўленне клуба БДУ плануе абмяняцца канцэртамі з Кішынёўскім політэхнічным інстытутам і з Калінінградскім універсітэтам. У гастрольныя паездкі адпраўляцца народны ансамбль танца «Крыжачок» і народны аркестр народных інструментаў.

З юбілейнымі праграмамі выступяць універсітэцкія артысты ў гарадах і вёсках Беларусі. Штотыднёвыя выезды ўключаны ў планы факультэцкіх агітбрыгад.

Цяпер творчыя сілы студэнтаў і іх настаўнікаў накіраваны на ўзорную падрыхтоўку да юбілею краіны. Умацоўваюцца мастацкія калектывы, фарміруецца рэпертуар сучаснага гучання.

**Л. ГАЎРЫЛАВА.**

## НАСУСТРАЧ 50-ГОДДЗЮ ЎТВАРЭННЯ СССР

СССР 50

Менш трох месяцаў аддзяляе нас ад слаўнага юбілею — 50-годдзя ўтварэння СССР. Шматтысячны калектыў універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, сустракае гэтую дату як вялікае, усенароднае свята. Важнейшая задача ўсяго прафесарска-выкладчыцкага саставу, кафедр, грамадскіх арганізацый заключаецца цяпер у тым, каб як мага шырэй і глыбей раскрыць студэнтам у сваіх лекцыях, гутарках і іншых мерапрыемствах сусветна-гістарычнае значэнне ўтварэння СССР, паказаць тыя вялізныя дасягненні, якіх дабіліся народы нашай краіны пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў развіцці эканомікі і культуры за гады Савецкай улады. Для гэтага ў кожнага выкладчыка маюцца вялікія магчымасці. Асабліва гэта адносіцца да нашай кафедры, дзе чытаюцца такія курсы, як эканамічная геаграфія СССР, геаграфія прамысловасці, сельскай гаспадаркі і транспарту СССР, эканамічная геаграфія БССР, эканамічнае раяніраванне СССР. У іх непасрэдна вывучаюцца асаблівасці прыродных умоў, насельніцтва і гаспадаркі краіны ў цэлым і асобных саюзных рэспублік.

У лекцыях, на семінарскіх і практычных занятках выкладчыкі кафедры выкарыстоўваюць самі і рэкамендуюць студэнтам не толькі вучэбныя падручнікі, але і той багаты матэрыял, які друкуецца ў газетах і часопісах, у спецыяльных кнігах і брашурах аб поспехах савецкіх народаў за 50 год існавання СССР.

Кафедра рэкамендавала выкладчыкам правесці ў гэтым навучальным годзе спецыяльныя семінары і практычныя заняткі, на якіх студэнты павінны на канкрэтным матэрыяле прааналізаваць зрухі ў размяшчэнні вытворчых сіл за гады Савецкай улады ў кожнай саюзнай рэспубліцы, паказаць у сваіх выступленнях, на спецыяльных картах развіццё эканамічных і культурных сувязей паміж імі, а таксама з зарубежнымі краінамі.

Дасягненням у развіцці гаспадаркі і культуры саюзных рэспублік да 50-годдзя ўтварэння СССР прысвечаны многія курсавыя і дыпломныя работы студэнтаў геаграфічнага факультэта. Гэта тэматыка займае важнае месца ў рабоце студэнцкага навуковага гуртка па эканамічнай геаграфіі.

Выкладчыкі кафедры прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні на факультэце палітінфармацый, гутарак, тэматычных вечароў па юбілейнай тэматыцы. Падрыхтавана выстаўка «Саюз непарушны». У гэтыя дні выкладчыкі кафедры часта выступаюць з лекцыямі на прадпрыемствах, у школах, падшэфных воінскіх часцях. Асноўная тэматыка лекцый—дасягненні ў развіцці эканомікі і культуры саюзных рэспублік да 50-годдзя ўтварэння СССР. На станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, Мінскім камвольным камбінаце чытаецца цыкл лекцый «У братняй сям'і савецкіх народаў». Найбольш актыўна выступаюць з лекцыямі дацэнты В. П. Барадзіна, Г. В. Анічэнка, А. С. Акінчыц і іншыя.

Рыхтуючыся дастойна сустрэць 50-годдзе ўтварэння СССР, кафедра ўзяла і рад іншых сацыялістычных абавязацельстваў. Сярод іх падрыхтоўка зборніка «Прамысловасць Беларусі да 50-годдзя ўтварэння СССР», заканчэнне напісання кнігі «Гомельская вобласць», абнаўленне асобных раздзелаў для перавыдання вучэбных дапаможнікаў «Геаграфія Беларусі» і «Эканамічная геаграфія БССР», падрыхтоўка метадычных указанняў да правядзення семінарскіх і практычных заняткаў па чытаемых курсах і інш. Калектыў кафедры прыкладзе ўсе намаганні да таго, каб гэтыя абавязацельствы выканаць.

**І. ТРУХАН, загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі, дацэнт.**

## КАБ НЕ ДАВЯЛОСЯ ЧЫРВАНЕЦЬ

**З першых дзён кастрычніка ва універсітэце пачаўся месячнік-агляд культуры паводзін і бытавых умоў студэнтаў. Мэта яго — дабіцца ўзорнага парадку ва універсітэце і ў інтэрнатах, пазнаёміць кожнага студэнта з правіламі, якія рэгламентуюць універсітэцкае жыццё, са статутам БДУ.**

**Прыналежнасць да старэйшай у рэспубліцы і аўтарытэтнай у краіне вышэйшай навучальнай установы, якім з'яўляецца наш універсітэт, абавязвае кожнага студэнта быць прыкладам высокай культуры паводзін, заўсёды мець дастойны знешні выгляд. На жаль, сярод нашых студэнтаў ёсць яшчэ людзі, якія пагарджаюць устаноўленымі правіламі, з'яўляюцца на заняткі неахайна апранутымі, нястрыжанымі, кураць дзе папала, псуюць мэблю ў аўдыторыях, паводзяць сябе нетактоўна са старэйшымі, дзяўчатамі і нават таварышамі. Каб не даводзілася чырванець за такіх прадстаўнікоў усяму універсітэцкаму калектыву, рэктарат, партком, камітэт камсамола распрацавалі ўмовы агляду і прыцягваюць да арганізацыі іх выканання дэканаў факультэтаў, сакратароў партыйных бюро, куратараў груп, камсамольскі і прафсаюзны актыў.**

## У ВНУ КРАІНЫ

**● Ленінградскі інстытут павышэння кваліфікацыі выкладання грамадскіх навук пры Ленінградскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Жданава і Петразаводскі універсітэт правялі нядаўна навукова-метадычную канферэнцыю «Актуальныя праблемы выкладання грамадскіх навук у святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС».**

**● У сёлетнім годзе да 15 факультэтаў народнага універсітэта пры Кіргізскім дзяржаўным універсітэце дабавіўся яшчэ адзін — факультэт эстэтычнага выхавання. Пакуль ён мае шэсць аддзяленняў: вакальнае, харавое, драматычнае, народных інструментаў, інструментальнае, харэаграфічнае.**

**З цягам часу межы факультэта эстэтычнага выхавання пашырацца: будуць адкрыты ізастудыя, кінастудыя, фотааддзяленне і інш.**

**Праграма факультэта эстэтычнага выхавання народнага універсітэта разлічана на тры гады. За гэты час студэнт авалодае ведамі, якія пасля заканчэння ВНУ зможа прымяніць на практыцы.**

*ЯК ЖЫВЕШ, ПЕРШАКУРСНІК?*

# ЮРЫСТЫ АБ САБЕ

Прайшоў месяц вучобы сёняшніх першакурснікаў ва універсітэце. Новы распарадак жыцця, новыя сябры, многа цікавага кожны дзень. Але хто-ніхто пачынае сумаваць, сумняваецца ў правільнасці абранага шляху. Хто-ніхто... Большасць жа верыць у свае сілы, у тое, што стаіць на правільнай дарозе. Верыць так, як гэтыя чацвёра студэнтаў I курса юрыдычнага факультэта. З імі мы сустрэліся пасля заняткаў. Хоць лекцыя ўжо скончылася хвілін пяць назад, ніхто не спяшаўся дадому. У аўдыторыі было шумна. Аб нечым спрачаліся ў кутку дзяўчаты, побач абмяркоўвалі, які фільм лепш паглядзець. Я папрасіла іх расказаць аб тым, як прыйшло да кожнага рашэнне стаць юрыстам.

**Галіна АЛАДЫШАВА:**

— Маё рашэнне не было выпадковым. Пасля школы я некалькі год працавала сакратаром судовых пасяджэнняў. Яшчэ тады мяне зацікавіла праблема злачыннасці сярод непаўналетніх. Што вызывае злачынства? Якая роля ў гэтым псіхалогіі і фізіялогіі падлетка? Над гэтымі пытаннямі я хачу працаваць.

**Мікалай БАРАДКО:**

— Я збіраўся стаць мастаком. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча. На юрыдычны факультэт мяне прывёў адзін выпадак: я не прайшоў па конкурсу ў тэатральна-мастацкі інстытут, пайшоў у рады Савецкай Арміі. Служыў у марфлоце, там жа стаў кандыдатам у члены партыі. Аднойчы мне давялося дапамагаць раскрываць адно злачынства — забойства чалавека. Тады я і пазнаёміўся з вельмі цікавым чалавекам, пракурорам. Сустрэчы з ім, гутаркі сталі пачаткам маёй новай біяграфіі.

**Ларыса МЯСАЕДАВА:**

— У маім жыцці не было яшчэ нічога асаблівага. На факультэт я прыйшла адразу пасля заканчэння школы № 28 г. Віцебска. Я вельмі люблю літаратуру і спачатку хацела стаць філолагам. Але не падумайце, што на юрфак прыйшла, начытаўшыся Конан Дойля. Проста вырашыла, што маё прызванне—дапамагаць людзям змагацца супраць недахопаў, за светлае і шчаслівае жыццё.

**Васіль БЕЛЬСКІ:**

— Юрыдычныя навукі падабаюцца мне за іх дакладнасць. Але я па натуры дабрадушны і таварыскі чалавек. Па гэтай прычыне не быць мне пракурорам ці следчым. Мая мара—умець дапамагчы людзям своечасовым, канкрэтным і кваліфікаваным адказам.

**Гутарку вяла Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

*Заканчваецца педагагічная практыка ў студэнтаў V курса гістарычнага факультэта. У адказ на пытанне, як яна праходзіла, метадыст, намеснік дырэктара СШ № 21 Людміла Аляксееўна Чаблакова добра адклікнулася аб групе. Але асабліва прыемнай была характарыстыка Аляксандра Канеўскага, які даваў урокі ў 10-м класе.*

*— Ён не першы год на практыцы ў гэтай школе, — гаворыць Людміла Аляксееўна. — І я яшчэ раз пераканалася ў тым, што Аляксандр не проста абаяльны чалавек, але ўжо і педагог са сваёй манерай весці урок. На маю думку, нават самая нецікавая тэма будзе пададзена ім жыва і захапляюча. Нездарма ж ён карыстаецца вялікай сімпатыяй у рабят.*



**НА ЗДЫМКАХ: 7-ы «А» клас СШ № 21. Апошні ўрок у сваёй студэнцкай практыцы вядзе Людміла Данько; выкладчык гісторыі Уладзімір Канстанцінавіч Мацвееў закончыў наш універсітэт у 1951 годзе. Накоплен вялікі вопыт, і ёсць чым падзяліцца з маладым калегам.**
**Фота Д. ЧАХОВІЧА.**







# З ДАЎНЯЙ МАРАЙ

Раніцай я вітаюся з клёнамі. Яны махаюць у адказ залатымі далонямі лісцяў: «Прывітанне, студэнтка!» Раптам здаецца, нібы клён, што ля нашага дома, кіўнуў галавой над гэтай дарожкай. Мой пасёлак у кайме сініх лясоў далёка, мая пяшчотная Пціч гаворыць не са мной, за партай маёй другая дзяўчына. І клён мой, бадай, у крыўдзе. Не яго лісточкі ў сшытку студэнткі. Сябра, прабач! Я спяшаюся на заняткі.

Што ў нас сёння? Фальклор, сучасная руская мова, зарубежная літаратура. Цікава, праўда? На стале стос агульных сшыткаў. У іх аўтографы верасня. Пэўна, каракулі (хоць бы ўсё запісаць). Так, а гэта што за слова? Та-а-ак, нялёгкія першыя крокі... Вось дзіўна: суткі сселіся, як новая сукенка пасля мыцця. Цесна! А кожны дзень, нібы свята...

Пасля заняткаў адразу за кнігу. Новыя тэрміны, імёны... І тут разумееш, колькі ўпушчана ў школьныя гады. Як упарта трэба працаваць цяпер. Для нас—светлыя аўдыторыі. Добрыя, разумныя людзі ідуць уперадзе, адкрываючы дарогу. І крыўдна губляць іх давер'е. Ярчэй заззяе мара. Больш упэўнены крок па зямлі.

...Кружыцца лісце. Я спяшаюся на заняткі, іду насустрач мары.

**Г. САЎРУК,**
**студэнтка I курса філфака.**

# НЕ ЗАБЫВАЮЧЫ ГАЗЕТУ

Пасля лекцыі ў калідоры горача спрачаюцца студэнты-першакурснікі. Аб прафесіі, адносінах да яе, неабходнасці ведаць сучасныя дасягненні не толькі гуманітарных, але і прыродазнаўчых навук.

Пасля знаёмства высветлілася, што амаль усе першакурснікі журфака трымалі цесную сувязь з раённымі газетамі. «Раёнкі» і накіравалі іх ва універсітэт і, безумоўна, чакаюць сваіх селькораў пасля пяцігадовага навучання добрымі спецыялістамі сваёй справы, журналістамі вострага пяра. Відавочна, кожнаму студэнту журфака і патрэбна глядзець на сваё будучае ў першую чаргу з гэтай пазіцыі.

Лявон Новікаў, напрыклад, будучы вучнем Кармянскай сярэдняй школы-інтэрната, актыўна супрацоўнічаў у раённай газеце «Зара над Сожам». На яе старонках часта паяўляліся змястоўныя фотарэпартажы, заметкі аб жыцці школьнікаў. Як лепшага селькора газета рэкамендавала юнака для паступлення на факультэт журналістыкі.

Не забыў Новікаў раённую газету і цяпер. Першымі ўражаннямі аб вучобе ва універсітэце падзяліўся ён з жыхарамі свайго раёна ў артыкуле «Я—студэнт».

Вельмі добра, каб на працягу ўсяго навучання студэнты нашага факультэта падтрымлівалі сувязь з раённымі газетамі. Бо давядзецца пачынаць свой самастойны шлях менавіта там. І мы павінны вучыцца ў першую чаргу размаўляць з вясковым хлебаробам, які ведае цану хлебу, цярпліва вырошчвае яго, каб заўсёды на нашым стале красаваўся духмяны каравай. Мы павінны выхаваць у сабе і іншых ласку і павагу да зямлі-карміліцы, да людзей, якія збіраюць з году ў год на ёй багаты ўраджай.

Мы паедзем працаваць у газеты рэспублікі, якія выходзяць на беларускай мове. Гэта патрабуе ад нас добрага ведання роднай мовы, фальклору. Бо інакш мы не зможам выклікаць на шчырую гутарку свайго субяседніка.

Ва універсітэце маюцца ўсе магчымасці, каб дасканала вывучыць сучасную беларускую мову. Выкладчык А. І. Наркевіч з першых лекцый прыкладае шмат намаганняў, каб раскрыць нам усю прыгажосць роднай мовы.

Па два гады працавалі ў раённых газетах і аўтары гэтых радкоў. Нялёгка прыходзілася на першых парах. Спецыфіка «раёнкі» патрабуе пісаць шмат, пісаць аператыўна. Даводзілася дабірацца ў гаспадаркі на спадарожных машынах, а бывала, і пешшу, па бездарожжы, у любое надвор'е. І мы верым, той, хто ўжо цяпер не толькі разумее сапраўднае прызначэнне журналіста, але і рыхтуецца да работы ў «раёнцы» без летуценнай рамантыкі, не будзе пасля заканчэння універсітэта шукаць месца па іншай спецыяльнасці.

**М. ЯГЕЛА,**
**М. ШЛЫК,**
**студэнты I курса факультэта журналістыкі.**

# ДОБРЫМ СЛОВАМ

Вярнуліся з калгасных палёў студэнты, а за імі прыйшлі і пісьмы-падзякі за вялікую дапамогу ў адрас дэканатаў і грамадскіх арганізацый універсітэта. Нядаўна адно з такіх пісем атрымаў дэкан факультэта журналістыкі. У ім гаворыцца: «Партыйная арганізацыя і праўленне калгаса імя У. І. Леніна Валожынскага раёна выносяць вялікую падзяку кіраўніцтву факультэта за аказаную дапамогу калгасу ва ўборцы бульбы.

Студэнты вашага факультэта, знаходзячыся на ўборачных работах, паказалі добры прыклад у арганізацыі працы і паводзінах. Яны штодзённа перавыконвалі нормы выпрацоўкі, праяўлялі зацікаўленасць да жыцця працаўнікоў сяла, адначасова праводзілі вялікую палітычную работу сярод насельніцтва.

Мы шчыра гаворым, што можна ганарыцца студэнтамі вашага факультэта. Мы таксама ўдзячны кіраўнікам груп Г. З. Бегуну, Л. Ф. Шылавай, А. А. Плаўнік, камісару П. Жукаву і камандзіру М. Калянковічу за іх вялікую работу па арганізацыі калектыву на сельскагаспадарчых работах, у выніку чаго 72 студэнты змаглі накапаць 876 тон бульбы з плошчы 51 га.

Жадаем кіраўніцтву факультэта, выкладчыцкаму саставу і ўсім студэнтам творчых поспехаў па дастойнай сустрэчы 50-годдзя СССР.

**Ф. КУЛАК,**
**сакратар партарганізацыі калгаса імя У. І. Леніна.**
**М. УЛАСІК,**
**старшыня калгаса».**

# ЗА АФІЦЫЙНЫМ РАДКОМ

**Прыемна чытаць загады, у якіх аб'яўляюцца падзякі студэнтам, паведамляецца аб залічэнні выдатнікаў на павышаныя стыпендыі. Але вось загады іншага характару: «Выключыць з ліку студэнтаў II курса журфака за акадэмічную запазычанасць Курушка А. П., Курленка Т. П.»; «Аб'явіць строгую вымову і выселіць з інтэрната за недастойныя паводзіны студэнтаў IV курса геафака Іванова В., Уласевіча М., Целяка А., Сідарэнку В., Здановіча І.**

**Выключыць з ліку студэнтаў IV курса геафака Каралёва В. за недастойныя паводзіны».**

**У якасці каментарыя паведамім, што прычынай такога пакарання з'явілася п'янка ў інтэрнаце, антысанітарны стан пакоя, дзе гэтыя студэнты «адзначылі» пачатак навучальнага года.**

**Знята са стыпендыі і атрымала строгую вымову камандзір атрада «Рэстаўратар» Маркоўская Л., зняты са стыпендыі 10 удзельнікаў гэтага ж атрада, студэнтаў гістфака, за калектыўную п'янку ў кемпінгу «Брэсцкі».**

**А. ВАСІЛЕВІЧ.**

# НАСУСТРАЧ X ФЕСТЫВАЛЮ

*28 ліпеня 1973 года ў сталіцы ГДР Берліне збярэцца прагрэсіўная моладзь свету на свой X Сусветны фестываль. Ужо пачаў работу Міжнародны падрыхтоўчы камітэт фестывалю, першае пасяджэнне якога прайшло ў сталіцы IX фестывалю Сафіі. У пасяджэнні прынялі ўдзел дэлегацыі 84 маладзёжных і студэнцкіх арганізацый з 47 краін свету.*

*Усе дэлегаты аднадушна выказаліся за прыданне будучаму X фестывалю ярка выражанай антыімперыялістычнай накіраванасці, за далучэнне да падрыхтоўкі фестывалю і да ўдзелу ў ім шырокіх сіл прагрэсіўнага руху моладзі і студэнтаў.*

*Сакратаром-каардынатарам X фестывалю выбран Дамінік Відаль, прадстаўнік Руху камуністычнай моладзі Францыі.*

*Сёння мы прыводзім тэкст Звароту да моладзі і студэнтаў усяго свету, які быў прыняты на пасяджэнні.*

X СУСВЕТНЫ ФЕСТЫВАЛЬ моладзі і студэнтаў адбудзецца ў Берліне, сталіцы Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, з 28 ліпеня па 5 жніўня 1973 года.

Дзевяць папярэдніх сусветных фестываляў значна садзейнічалі развіццю барацьбы самых шырокіх мас моладзі і студэнтаў, узмацненню адзінства дзеянняў маладзёжных і студэнцкіх арганізацый рознай палітычнай, філасофскай і рэлігійнай арыентацыі за салідарнасць, мір і дружбу, за ўмацаванне супрацоўніцтва, дружбы і ўзаемаразумення паміж моладдзю ўсяго свету.

Пасля IX фестывалю ў Сафіі рух моладзі, якая змагаецца супраць імперыялізму і яго палітыкі войн, эксплуатацыі і рэпрэсій, няўхільна разрастаецца і ўмацоўвае свае пазіцыі. У цяперашні час перад рэвалюцыйнымі, дэмакратычнымі і прагрэсіўнымі сіламі, якія ў вялікім гістарычным проціборстве атрымліваюць верх над сіламі імперыялізму і рэакцыі, адкрыты новыя натхняючыя перспектывы.

Моладзь і студэнцтва ўсё больш актыўна ўдзельнічаюць у сацыяльнай і палітычнай барацьбе народаў, дынамічна ўключаюцца ў барацьбу за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, за свабоду і незалежнасць, за дэмакратыю і грамадскі прагрэс, за пабудову новага грамадства.

За час, які прайшоў пасля IX фестывалю, сілы прагрэсу, міру і дэмакратыі дзякуючы сумеснай барацьбе нанеслі новыя ўдары па імперыялізму. Перад фактам пастаянных паражэнняў і цяжкасцей імперыялізм становіцца ўсё больш агрэсіўным, імкнецца ўсімі сіламі захаваць і вярнуць страчаныя пазіцыі. Перамогі гераічных народаў В'етнама, Лаоса і Камбоджы, поспехі сіл прагрэсу ва ўсім свеце паказваюць, што сёння можна прымусіць адступіць сілы імперыялізму і рэакцыі і ў канчатковым выніку перамагчы іх.

Мы таксама разумеем, што далейшыя дзеянні і ўмацаванне адзінства ўсіх прагрэсіўных сіл цяпер больш, чым калі-небудзь, магчымы і неабходны для захавання міру і бяспекі на зямлі, забеспячэння свабоды і незалежнасці народаў, для развіцця дэмакратыі і прагрэсу.

Мы глыбока перакананы ў тым, што падрыхтоўка і правядзенне X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў з'явяцца маніфестацыяй адзінства маладога пакалення ў барацьбе супраць імперыялізму, за салідарнасць, мір і дружбу.

Мы вітаем ініцыятыву Саюза свабоднай нямецкай моладзі і выказваем яму нашу ўдзячнасць за прапанову правесці X фестываль у сталіцы Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, уклад якой у антыімперыялістычную барацьбу, яе палітыка міру і супрацоўніцтва ў Еўропе і ва ўсім свеце карыстаюцца падтрымкай шырокіх мас моладзі і студэнтаў.

Мы заклікаем маладзёжныя і студэнцкія арганізацыі, моладзь і студэнцтва ўсяго свету, незалежна ад палітычных і ідэалагічных поглядаў, рыхтавацца да ўдзелу ў X фестывалі — новым важным этапе ўмацавання барацьбы за мір, прагрэс і лепшую будучыню.

Падрыхтоўка і змест X фестывалю ставяць наступныя мэты:

— адзінадушна выказаць міжнародную салідарнасць з гераічнай барацьбой народаў В'етнама, Лаоса і Камбоджы, патрабаваць безагаворачна і поўнасцю вывесці амерыканскія войскі з Індакітая, спыніць падтрымку марыянетачных рэжымаў Сайгона, В'енцьяна, Пном-Пеня, каб дазволіць народам гэтых краін самім вырашаць свае справы без замежнага ўмяшання;

— стаць магутнай дэманстрацыяй салідарнасці з нацыянальна-вызваленчым рухам, з барацьбой моладзі арабскіх краін, Палясціны, з народамі партугальскіх калоній, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і Азіі за сваю свабоду і нацыянальную незалежнасць, за дэмакратыю і сацыяльны прагрэс, супраць каланіялізму, расізму, сіянізму і апартэіду;

— дазволіць моладзі і студэнцтву зямнога шара выказаць сваю салідарнасць з моладдзю сацыялістычных краін, што будуюць сацыялізм, якая супрацьстаіць імперыялістычным манеўрам і правакацыям і ўнясе рашаючы ўклад у барацьбу за мір, дружбу і салідарнасць;

— выказаць салідарнасць з гераічнай барацьбой моладзі і студэнтаў капіталістычных краін супраць эксплуатацыі і гнёту манаполій, супраць рэпрэсій, за свае правы, за задавальненне сваіх імкненняў, за глыбокія эканамічныя і сацыяльныя пераўтварэнні, за дэмакратыю;

— з'явіцца новай шырокай міжнароднай маніфестацыяй з моладдзю і студэнтамі, якія змагаюцца супраць фашызму, за свабоду і дэмакратыю;

— выказаць рашучасць моладзі ўсяго свету змагацца супраць імперыялізму, у першую чаргу супраць імперыялізму ЗША, і мілітарызму;

— пацвердзіць думы і імкненні моладзі актыўна ўдзельнічаць у барацьбе за раззбраенне і мір, аб чым сведчаць шырокія і важныя ініцыятывы моладзі Еўропы за бяспеку і супрацоўніцтва на гэтым кантыненце.

X фестываль адлюструе ўсе важнейшыя праблемы нашага часу, якія закранаюць моладзь і студэнтаў зямнога шара, а таксама барацьбу сённяшняга дня — ва ўсёй яе разнастайнасці — за дасягненне агульных мэт. Ён стане кульмінацыяй і новым этапам гэтай барацьбы.

X фестываль прадоўжыць багатыя традыцыі папярэдніх фестываляў, будзе важнай і натхняючай палітычнай, культурнай і спартыўнай падзеяй у жыцці моладзі і студэнтаў.

Мы заклікаем моладзь і студэнтаў усіх краін на аснове антыімперыялістычнага адзінства пачаць самую шырокую падрыхтоўку да X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.

Мы запрашаем міжнародныя і нацыянальныя арганізацыі, усе палітычныя, прафсаюзныя і культурныя арганізацыі моладзі і студэнтаў, якія падтрымліваюць гэты заклік, уключыцца ў шырока адкрытую падрыхтоўку фестывалю, унесці свой уклад у выпрацоўку яго праграмы, ствараць, зыходзячы з нацыянальных асаблівасцей, нацыянальныя падрыхтоўчыя камітэты з самым шырокім прадстаўніцтвам для забеспячэння ўдзелу ўсіх сіл, якія падзяляюць мэты фестывалю і гатовы ўнесці свой уклад у яго поспех.

Прадоўжым і разгорнем магутны сусветны фестывальны рух, забяспечваючы поспех X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Берліне, які з'явіцца буйнейшым мерапрыемствам барацьбы за салідарнасць, мір і дружбу, грандыёзнай дэманстрацыяй адзінства моладзі ў антыімперыялістычнай барацьбе!

Няхай жыве X Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў!

---

Народны кантроль

# БЫЦЬ БЕРАЖЛІВЫМІ ГАСПАДАРАМІ

**Вялікія клопаты Камуністычнай партыі аб развіцці вышэйшай адукацыі яскрава праяўляюцца ў своечасовым забеспячэнні вышэйшых навучальных устаноў навейшым вучэбна-лабараторным абсталяваннем, укараненні ў навучальны працэс тэхнічных сродкаў навучання і іншых мерапрыемствах. Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» таксама падкрэслівае неабходнасць усямернага ўмацавання матэрыяльнай базы вну. Пастанова завастрае ўвагу грамадскіх арганізацый вышэйшых навучальных устаноў на важнасці сканцэнтравання намаганняў і стварэння неабходных умоў для вучобы студэнтаў і працы выкладчыкаў.**

**І, разам з тым, партыйныя і грамадскія арганізацыі навучальных устаноў павінны выхоўваць калектыў у духу беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці ў цэлым і да вучэбнага абсталявання ў прыватнасці.**

**У ліку іншых гэтае пытанне абмяркоўвалася на нарадзе партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага актыву універсітэта напярэдадні новага навучальнага года. У сваім дакладзе прарэктар БДУ С. А. Умрэйка падкрэсліў неабходнасць хутчэйшага выяўлення і ліквідавання ўсіх недахопаў у сферы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння вучэбнага працэсу.**

**Кіруючыся рашэннем нарады, група народнага кантролю гістарычнага факультэта сумесна з прадстаўнікамі дэканата і прафсаюзнага бюро ў верасні абследавала, як падрыхтаваны да заняткаў аўдыторыі 5-га і 6-га паверхаў галоўнага корпуса, дзе размешчан гістфак.**

**Праверка паказала, што амаль у кожнай з абследаваных аўдыторый маюцца дэфекты, якія ў той ці іншай ступені могуць школдзіць правядзенню заняткаў і якія неабходна як мага хутчэй ліквідаваць, каб лепш забяспечыць вучэбны працэс і захаваць у належным парадку універсітэцкую маёмасць.**

**Нельга, напрыклад, нармальна праводзіць заняткі, калі ў аўдыторыі не працуе ад 50 да 80 працэнтаў лямп дзённага асвятлення (аўд. 522, 605, 606, 609). Непрыгодныя для заняткаў таксама дошкі раду аўдыторый (у аўд. 609 дошка разрэзана, а ў аўд. 610 яна чырвонага колеру). Асабліва многа дэфектаў выяўлена ў вокнах, што можа недабратворна ўплываць у зімовы перыяд. Пераважная большасць вокан дрэнна закрываецца, а многія ўвогуле не закрываюцца ў верхняй частцы. Як у вокнах у калідорах, так і ў аўдыторыях (508, 510, 601, 602, 606, 607, 609, 610 і іншых) няма двайнога шкла, фрамуг, ручак для закрывання. Гэта кампенсуецца мноствам забітых цвікоў.**

**Вынікі праверкі былі абмеркаваны на пасяджэнні партыйнага бюро гістарычнага факультэта, якое прыняло рашэнне накіраваць на імя прарэктара па гаспадарчай частцы універсітэта дакладную запіску з пералікам выяўленых недахопаў і з просьбай аб хутчэйшым і па магчымасці поўным іх ліквідаванні.**

**І. ЛІТВІНОЎСКІ,**
**старшыня групы народнага кантролю гістарычнага факультэта.**

---

# ЗА МАЙСТЭРСТВА І ФІЗІЧНУЮ ДАСКАНАЛАСЦЬ

Спорт

1972 год праходзіць пад дэвізам «Алімпійскі год — не толькі для алімпійцаў». І нашы спартсмены імкнуцца заваяваць новыя вяршыні. У параўнанні з мінулым годам мы палепшылі спартыўныя вынікі па 18 відах спорту. Адчуваецца, што рэктарат, партком і ўсе грамадскія арганізацыі прынялі самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы зборных каманд універсітэта па розных відах спорту.

Паспяхова выступіла ў юбілейным годзе зборная каманда па лёгкай атлетыцы, якую рыхтавалі да спаборніцтваў ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту М. С. Жаўнерка і выкладчык В. В. Зарэцкая. Выдатны вынік на першынстве ЦС СДСТ «Буравеснік» паказала студэнтка III курса гістфака Людміла Кайгародава. Яна скокнула ў даўжыню на 6 м 33 см і стала чэмпіёнкай.

Жаночая каманда па баскетболу — Л. Жабінская, О. Аніскевіч, Л. Хілько, В. Смірнова, Р. Чэпайтэ — (трэнер Г. М. Грудо) стала чэмпіёнам СДСТ «Буравеснік», уладальнікам кубка горада Мінска, сярэбраным прызёрам першынства БССР.

Другое агульнакамандн ае месца занялі нашы цяжкаатлеты. Тут поспеху дабіліся студэнт юрфака М. Жыцянёў і школьнік В. Касько, член спартыўнага клуба БДУ.

Няпоўнай камандай выступалі на першынстве СДСТ «Буравеснік» веславальшчыкі, але, узначальваемыя трэнерам і ўдзельнікам спаборніцтваў Г. В. Андрыеўскім, яны ўсе сілы прыклалі да таго, каб дабіцца лепшых паказчыкаў. У выніку V месца (161 ачко) замест VI у мінулым годзе (145 ачкоў), калі зборная выступала ў поўным саставе.

Цяпер на павестцы дня спартыўнага клуба і кафедры фізвыхавання і спорту — клопаты аб фізічнай дасканаласці студэнтаў універсітэта, шырокае ўкараненне комплексу ГПА. Хочацца адзначыць ініцыятыўнасць факультэта прыкладной матэматыкі. Партыйнае бюро, камітэт камсамола і грамадская камісія, узначальваемая дэканам факультэта прафесарам Я. А. Івановым, праводзяць вялікую і карысную работу па падрыхтоўцы і правядзенню здачы норм ГПА.

ФПМ — малады ва універсітэце, але па спартыўных дасягненнях ён знаходзіцца ў ліку вядучых факультэтаў.

У мінулым навучальным годзе студэнты ўсіх курсаў ФПМ, а таксама студэнты спецыяльнага факультэта прыкладной матэматыкі выйшлі на старт лыжных спаборніцтваў. Своечасова ўсім студэнтам былі растлумачаны палажэнне аб здачы норм ГПА, кантрольныя нарматывы для атрымання залатых і сярэбраных значкоў ГПА. І цяпер на факультэце добра аформлена наглядная агітацыя: «Спорт на факультэце», «Ступені новага комплексу ГПА», «Лепшыя студэнты-спартсмены факультэта».

Вялікая работа па прапагандзе новага комплексу ГПА праводзіцца на гістарычным, фізічным, юрыдычным факультэтах, але і яны знойдуць што пераняць на факультэце прыкладной матэматыкі.

**КАМІНСКІ,**
**старшыня спартыўнага клуба БДУ.**

## НОВЫЯ КНІГІ ПА БІЯЛОГІІ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ Ў ВЕРАСНІ

1. Аладьев В. З. К теории однородных структур. Таллин, 1972.
2. Ведущие факторы онтогенеза. (Сборник статей. Ред. коллегия: В. Н. Никитин и др.) Киев, «Наукова думка», 1972.
3. Использование и трансформация пуриновых и пиримидиновых соединений микроорганизмами. Рига, 1972.
4. Коновалов С. А. Биосинтез ферментов микроорганизмами. М., «Пищевая пром-сть», 1972.
5. Могендович М. Р. Мозг и жизнь. Биология. Пермь, Кн. изд-во, 1972.
6. Незлин Р. С. Строение биосинтеза антител. М., «Наука», 1972.
7. Проблемы современной биологии. Доклады и сообщения 1969—1970 г. Л., Изд-во Ленингр. ун-та, 1972.
8. Системные исследования. Ежегодник, 1971. М., «Наука», 1972.
9. Современные проблемы радиобиологии. Под общ. ред. чл.-корр. АН СССР А. М. Кузина. Т. 3. М., Атомиздат, 1972.
10. Тринкаус Дж. От клеток к органам. Пер. с англ. М., «Мир», 1972.



# ДА ПАСЛУГ СТУДЭНТАЎ

*Вось ужо паўтара года здраўпункт БДУ працуе як паліклінічнае аддзяленне ад 6-й паліклінікі трэцяга клінічнага аб'яднання. Такая рэарганізацыя дазволіла намнога палепшыць медыцынскую дапамогу студэнтам. Павялічыўся штат медработнікаў. Расшыраны памяшканні паліклінікі. Студэнт можа атрымаць кваліфікаваную дапамогу не толькі ў тэрапеўта, але і ў акуліста, неўрапатолага, оталарынголага, хірурга.*

*Пры паліклініцы працуе клінічная лабараторыя, значна палепшаны ўмовы ў кабінеце фізіятэрапіі.*

*Урачы паліклінічнага аддзялення могуць зараз удзяліць вялікую ўвагу прафілактычным аглядам студэнтаў, санітарна-асветніцкай рабоце.*

*Усе ўрачы-тэрапеўты замацаваны за факультэтамі і інтэрнатамі. Кожны хворы студэнт мае магчымасць лячыцца ў «свайго» ўрача, таму што прыём арганізаван пазменна, з 8-00 да 20-00 гадзін.*

*Ф. РЭЗНІКАВА, загадчыца паліклінікі.*



**НА ЗДЫМКАХ:** урач Ф. П. Рэзнікава прымае чарговага наведвальніка; урач М. З. Кліорына і медсястра З. А. Беразоўская вырашаюць пытанні дыспансерызацыі хворых.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

# ШТО ДЛЯ МЯНЕ ПАЭЗІЯ

**Паэзія... Шмат думак, пачуццяў будзіць яна ў чалавеку і выклікае нямала спрэчак аб сваёй сутнасці.**
**Сёння размову аб паэзіі пачынаюць філолагі.**
**Чакаем вашых водгукаў.**

Дагэтуль мне не даводзілася ніколі аб гэтым разважаць. Сапраўды, а што ж для мяне паэзія?

Паэзія — адзін з відаў літаратурнай творчасці, увогуле літаратуры, такім чынам, у пэўнай ступені — мая будучая спецыяльнасць.

Але ці можа быць паэзія спецыяльнасцю, як нейкая спецыяльнасць вытворчая? Ці чалавек, не звязаны па сваёй прафесіі з літаратурай, не можа паэзію ўспрымаць? Хіба паэзія — прывілея нейкага кола задуменных інтэлектуалаў?

Вядома, не. Паэзія — для ўсіх, і ўсе — для паэзіі.

Але наколькі б аб'ектыўнай ні была паэзія, успрыманне яе — працэс суб'ектыўны. Спытайце паасобку прыхільнікаў таго ці іншага паэта — кожны знаходзіць у яго нешта сваё, асабістае. Таму ў кожнага чалавека свой погляд на паэзію, кожнаму здаецца, што бясхібны.

Пераканаць чалавека ў яго эстэтычных заблуджэннях цяжэй, чым растлумачыць, што добра, а што дрэнна, таму што, як мне здаецца, пачуццё прыгожага ў пэўнай ступені фарміруецца ў чалавека несвядома, інстынктыўна. Вельмі цяжка пісаць аб сваіх адносінах да паэзіі. Гэта, відаць, яшчэ больш інтымная справа, чым працэс творчасці, таму што і сам творчы працэс грунтуецца на гэтых пачуццях. Гэтыя пачуцці такія ж асабістыя, як і ўспрыманне паэзіі, як каханне, як любоў да Радзімы.

Чалавек, незалежна ад дасканаласці ці абмежаванасці яго эстэтычных прынцыпаў, нягледзячы падзяляе ўсе з'явы рэчаіснасці на добрыя і дрэнныя. Такім жа чынам падзяляе ён і паэзію. І тут ужо чым вышэй яго адукаванасць і эстэтычныя патрабаванні, тым больш твораў адыходзіць у разрад дрэнных (амаль добрых). Відаць, не трэба абвінавачваць чалавека ў нігілізме за тое, што яму не падабаецца тое, што падабаецца іншаму.

Час бяжыць хутка. Няхай не праз сто, дык праз тысячу год, можа, на нашу сучасную літаратуру будуць глядзець з усмешкай. Змяняюцца акалічнасці, змяняецца жыццё, змяняюцца людзі. Але ў іх будзе тое, што ёсць і ў нас — пачуццё прыгожага, мабыць такога, якога нам зараз не зразумець. І ў кожнага будзе свой асабісты погляд на паэзію, кожны будзе бачыць у ёй нешта сваё. І толькі ў залежнасці ад меркі чалавека да паэзіі паэзія можа мець мерку да чалавека.

С. ПАЛІТЫКА.

Раней я не ставіла перад сабой такога пытання. Ды здавалася ўсё гэта зусім простым. Але цяпер вось, калі патрэбна выказаць неяк свае адносіны да паэзіі, яно здаецца далёка не такім ужо і простым.

Зразумела толькі адно: паэзія — гэта нешта неабходнае і вельмі патрэбнае. Мне вельмі падабаюцца словы вядомага савецкага паэта Куліева, які так выказаў свае погляды на паэзію: «Паэзія можа быць сумнаю маці, якая плача над паміраючым сынам, і дзяўчынай, якая лёгкай паходкаю ідзе міма вашых вокан майскай раніцай. Яна бывае квітнеючай вішняй і грознай маланкай, усмешкай дзіцяці і стогнам пераможанага палкаводца. Паэзія ўсюды — у воблаках і ў агародзе маёй маці, дзе жаўцее сланечнік і расце морква. Паэзія — вечная спадарожніца чалавека — жыве, стаўшы народнай пагаворкай і трагедыямі Шэкспіра. Яна — калыханка сялянкі і шэдэўры сусветных паэтаў. Яна і дзіцячая песенька і Дантава «Боская камедыя». Паэзія розная, як цэлы свет, і цудоўная, як зямля. Яна голас жыцця, яе рэха і радуга».

Наўрад ці можна напісаць што-небудзь лепшае.

Для кожнага зразумела, што паэзія павінна быць праўдзівай, інакш яна і не будзе паэзіяй. Толькі ў такім выпадку яна зможа прымусіць мацней біцца сэрца, прымусіць перажыць тое, што перажывае сам паэт.

Паэзія — гэта тое, што здольна выклікаць пачуцці ў чалавека. І гэта вельмі правільна. Далёка не кожны вершаваны радок — паэзія.

Але часам мне становіцца страшна. Страшна ад таго, што я не разумею паэзію. Люблю і не разумею. Ёсць шмат цікавых, таленавітых паэтаў, якіх я люблю, чытаю і перачытваю.

У вас кепскі настрой, нешта цяжкае ляжыць на душы, нават сонца не так ярка свеціць і трава не так зелянее. Адкрыйце томік вашага любімага паэта. І ўбачыце — дапаможа. Калі застанецца сум, то ён будзе нейкім другім, больш светлым. Асабліва мне гэта давялося адчуць, калі надарылася быць некалькі месяцаў за мяжой.

Лермантаў і Ясенін, з іх сыноўняй любоўю да роднага краю, роднай зямлі, рускай бярозкі, сталі маімі лепшымі сябрамі. Я перажывала шчаслівыя хвіліны, калі, забыўшыся на ўвесь шум, клопаты, забіралася ў самы ціхі куток і заставалася толькі з імі. У той час яны былі для мяне бліжэй і даражэй, чым калі-небудзь раней.

Зусім па-іншаму прагучалі для мяне сапраўды крылатыя ясенінскія радкі:

Если крикнет рать святая:
«Кинь ты Русь, живи в раю!»
Я скажу: «Не надо рая,
Дайте родину мою.

Але я гаварыла, што часам не разумею паэзіі.

Максім Танк... Народны паэт, пясняр зямлі беларускай, апроч усяго, мой зямляк. Якія шырокія ў яго тэмы. Здаецца, якое б пытанне ні ўзяў, яго абавязкова знойдзеш у Танка. Падабаюцца мне такія вершы, як «Жэтон», «Родная мова», «Ave Maria» і іншыя? Але многае ў Танка застаецца для мяне незразумелым. З прыемнасцю чытаю радкі, прысвечаныя нашай Нарачы, Мядзельшчыне. Здаецца, добра, але асаблівых такіх пачуццяў яны не выклікаюць, тым больш, калі чытаю яго вольныя вершы. Так, яны разумныя, глыбокія, але цяжкія для чытання і тым больш для запамінання. І яшчэ бяда (а магчыма, віна) у тым, што я не адчуваю ў вершах Танка музыкальнасці, меладычнасці.

Яшчэ раз хочацца падкрэсліць, што творчасць, паэзія не могуць абысціся без радасці, як і само жыццё, бо чалавек імкнецца да яе. Але зразумела і тое, што паэзія не можа вызваліць сябе і ад суму, нават ад гора. Акрамя войнаў, на свеце ёсць хваробы, смерць. Таму няхай часам і гучаць у вершах ноткі смутку, але ж паэт цвёрда верыць у жыццё, у тое, што над зямлёй ёсць сонца. Гэта з-пад пяра Багдановіча выйшлі радкі:

Не злічыць у небе ясных зорак,
Не злічыць у сэрцы светлых дум.

Або возьмем рускага паэта, аднаго з самых трагічных паэтаў стагоддзя — Блока. Хіба ён адмаўляе жыццё?

О, я хочу безумно жить:
Все сущее — увековечить,
Безличное — очеловечить,
Несбывшееся—воплотить.

І, вядома, калі паэт перастане верыць у жыццё, у яго сэнс, то яму няма ўжо сэнсу і пісаць. Бо паэзія ствараецца людзьмі і для людзей.

Паэзія цудоўная і вечная. Яна створана для жыцця і служыць людзям.

І ў заключэнне хочацца зноў прачытаць Куліева, тым больш, што прыведзеныя ніжэй словы маюць глыбокі сэнс.

Чалавек гаворыць:
— Мне добра.
Паэзія адказвае:
— Я з табой.
Чалавек стогне:
— Мне дрэнна.
Паэзія адгукаецца:
— Я з табой.

Л. АЎГУСЦІНОВІЧ.

Кафедра гісторыі філасофіі і логікі выказвае глыбокае спачуванне в. а. прафесара А. С. КЛЯЎЧЭНЮ з выпадку напаткаўшага яго гора—смерці бацькі.

# ГІСТАРЫЧНЫЯ АНЕКДОТЫ

**На старасці год кампазітар Шарль Гуно часта паўтараў:**

**— Калі мне было дваццаць, я няспынна сцвярджаў: «Я-я». У трыццаць мая думка змянілася, і я ўжо гаварыў: «Я і Моцарт»; у сорак — «Моцарт і я». Цяпер жа я з глыбокай пашанай гавару: «Моцарт».**

●

**У час вайны з персамі грэчаскі палкаводзец Фемістокл запатрабаваў ад жыхароў вострава Андрос пакорлівасці і вялікай сумы грошай.**

**— Я раблю гэта ад імя двух вялікіх багоў: Сілы і Пераканання! — сказаў Фемістокл.**

**— На пакорлівасць згодны, але ў грошах адмаўляем у імя дзвюх такіх жа магутных багінь: Беднаты і Немагчымасці! — адказалі жыхары вострава.**

●

**Глыбокім старым Анаксагор, настаўнік Перыкла, прыйшоў у крайнюю беднасць і рашыў замарыць сябе голадам. Даведаўшыся аб гэтым, Перыкл прыйшоў да настаўніка і стаў прасіць яго пакінуць гэты намер.**

**— Твае парады ўсё яшчэ неабходны мне,—гаварыў Перыкл.**

**— Хто мае патрэбу ў святле лампады,—адказаў Анаксагор,—той не забывае падліваць у яе масла!**

●

**Вядомы англійскі драматург Шэрыдан дазволіў сабе ў адной са сваіх драм даволі непахвальна выказацца аб парламенце. У спагнанне за гэта ён павінен быў прыйсці ў парламент, стаць на калені і папрасіць прабачэння.**

**Пісьменнік выканаў прыгавор, але, устаючы з кален і атрахаючы хусцінкай штаны, усклікнуў: «Божа, якая ж тут гразь».**

●

**Аднойчы да Бернарда Шоу прыйшоў няўдачнік-баскетбаліст і папрасіў дапамагчы яму стаць пісьменнікам. Шоу моўчкі прачытаў яго рукапіс і сказаў:**

**— Цяпер я разумею, чаму з вас не выйшаў баскетбаліст.**

**— Чаму!**

**— Таму што вы не можаце кідаць у карзіну своечасова,—адказаў пісьменнік.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 02355
Зак. 1145

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз.